УДК 304.442

# ПОМНІКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ АСВЕТНІКАМ І ПІСЬМЕННІКАМ НА БЕЛАРУСІ

**Е.У.Пацоўская,** X клас, **М.Э.Кавалевіч**, XI клас
Навучны кіраўнік – **Л.А.Райчук**, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
**ДУА "Сярэдняя школа № 1 г.Пінска"**

Помнікі пісьменнікам адыгрываюць важную ролю ў захаванні культурнай спадчыны і напамінаюць пра значнасць асветы і літаратуры ў жыцці людзей і грамадства. Акрамя гэтага, становяцца месцам турыстычных паездак і паломніцтва для людзей, якія захоплены культурай і літаратурай.

Аднак некаторыя крытыкі могуць адносіцца да такіх помнікаў як да празмерна перабольшанай формы пакланення той ці іншай знакамітай асобе. Можа мець месца такая з'ява, як вялікая колькасць помнікаў аднаму літаратурнаму дзеячу і адсутнасць або малая колькасць другому. Таму аналіз сацыяльных функцый помнікаў, знаёмства з тым, якім беларускім пісьменнікам пастаўлены помнікі ў Беларусі, у якіх населеных пунктах і па якой прычыне, будзе актуальным і мэтазгодным.

**Мэта** – акрэсліць функцыі помнікаў; сабраць, класіфікаваць і абагульніць інфармацыю пра помнікі нацыянальным асветнікам і пісьменнікам на Беларусі.

**Задачы**:

1) раскрыць паняцце "помнік" і вызначыць яго сацыяльныя функцыі;
2) высветліць, у якіх населеных пунктах, калі, якім нацыянальным літаратурным дзеячам і па якой прычыне былі ўзведзены помнікі (акрамя надмагільных) і бюсты ў Беларусі;
3) правесці класіфікацыю помнікаў і бюстаў па абласцях, населеных пунктах, а таксама па асобах пісьменнікаў, якім былі пастаўлены помнікі на Беларусі;
4) стварыць інтэрактыўную карту Беларусі з выявамі помнікаў і бюстаў.

Сацыльныя функцыі помнікаў звязаны з вызначэннем розных бакоў грамадскай і асабістай дзейнасці чалавека. У працоўнай, адукацыйнай, бытавой сферы, сферы ўзаемаадносін помнікі так ці інакш уплываюць на фарміраванне грамадскага і духоўнага светапогляду, фарміраванне патрыятычных пачуццяў, паводзіны людзей, рэгулююць іх учынкі, выбар каштоўнасцей.

Вывучэнне помнікаў не з'яўляецца самамэтай, а спрыяе больш глыбокаму пранікненню ў сутнасць з'явы, літаратурнага працэсу, знаёмству з біяграфіяй знакамітай асобы, рысамі характару.

Правёўшы класіфікацыю па месцах установкі помнікаў, трэба адзначыць, што больш за ўсё помнікаў пастаўлена ў Мінску і Мінскай вобласці, зусім няма помнікаў беларускім пісьменнікам у Магілёве і адзін пастаўлены ў Магілёўскай вобласці. Адсутнічаюць помнікі літаратарам і ў нашым горадзе Пінску.

Самая большая колькасць – сем і восем помнікаў – устаноўлены зоркам беларускай літаратуры Янку Купалу і Якубу Коласу адпаведна. Чатыры помнікі – Францыску Скарыне і Адаму Міцкевічу. Па тры помнікі – Ефрасінні Полацкай, Кірылу Тураўскаму, Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, Уладзіміру Караткевічу.

Помнікі і бюсты звычайна ўсталёўваюцца на радзіме пісьменнікаў і ў месцах, дзе яны праводзілі значную частку свайго жыцця, дзе імі былі напісаны важныя для літаратуры творы.

У Беларусі дастаткова ўвагі ўдзяляецца захаванню калектыўнай гістарычнай памяці праз устаноўку помнікаў літаратарам.

У рабоце высветлена, у якіх населеных пунктах, калі, якім нацыянальным літаратурным дзеячам і па якой прычные былі ўзведзены помнікі (акрамя надмагільных) і бюсты ў Беларусі; праведзена класіфікацыя помнікаў і бюстаў па абласцях, населеных пунктах, а таксама па асобах пісьменнікаў, якім былі пастаўлены помнікі і бюсты ў Беларусі; складзена інтэрактыўная карта

“Помнікі нацыянальным асветнікам і пісьменнікам на Беларусі” з выявамі скульптурных кампазіцый і бюстаў.

У выніку можна сцвярджаць, што гіпотэза аб ушанаванні памяці нацыянальных асветнікаў і пісьменнікаў на Беларусі праз усталяванне помнікаў пацвержана.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Мятліцкая, І. Гісторыя ствараецца тут і цяпер. Мастакі ў храме кнігі. Скульптура / І. Мятліцкая // Мастацтва. – 2006. – № 6. – С. 44

2. Кравченко, И. Г. Памятник как социальный феномен : дис…. канд. филос. наук

3. [Электронны рэсурс] / И. Г. Кравченко. – Волгоград, 2008. – 137 с. – Рэжым доступу: http://www.dslib.net/soc-filosofia/pamjatnik-kak-socialnyj-fenomen.html. – Дата доступу: 25.09.2023.